**В. У. Літвін,**
намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце
настаўніца беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі

**«Зорны тыдзень настаўніка прадметніка»**

# Майстар-клас «Прадметный тыдзень як мадэль комплекснай пазакласнай работы»

## Планаванне, арганізацыя і правядзенне комплексу мерапрыемстваў

Асноўнай мэтай вучэння для сучасных школьнікаў часта становіцца паспяховая здача цэнтралізаванага тэсціравання, бо яго балы вызначаюць кола магчымасцей выбару. Менавіта таму вучні старанна асвойваюць навыкі работы з тэстамі, механічна завучваць правілы, выключэнні, што звужае пазнанне навукі і перашкаджае фарміраванню цэласнай карціны свету.

Для паглыблення ведаў па прадмеце, развіцця здольнасцей, расшырэння кругагляду навучэнцаў неабходна павысіць цікавасць, стварыць дадатковы матыў. Гэтая задача вырашаецца шляхам арганізацыі пазакласнай работы па прадмеце.

Сучасная адукацыйная практыка прапануе шмат форм арганізацыі пазакласнай работы з вучнямі: алімпіяды, факультатывы, КВЗ, эстафеты, марафоны, гульні, канферэнцыі і інш. Але найбольш актуальнымі з'яўляюцца такія формы, якія не толькі даюць дадатковую інфармацыю, але і падахвочваюць вучняў да эўрыстычнага пошуку, што дазваляе кароткачасовую цікавасць перавясці ў доўгачасовую, ўстойлівую.

Разавыя школьныя мерапрыемствы па вучэбных прадметах стымулююць цікавасць, у асноўным, у паспяховых навучэнцаў. Як жа павысіць імкненне да вывучэння агульнаадукацыйных прадметаў у дзяцей з сярэднім узроўнем паспяховасці, матываваць іх да павышэння планкі ведаў, развіцця эрудыцыі? Адзін з варыянтаў вырашэння гэтай задачы – арганізацыя і правядзенне тэматычных ці прадметных тыдняў як комплекснай мадэлі пазакласнай работы. Менавіта

комплексныя мерапрыемствы дазваляюць максімальна прыцягнуць навучэнцаў з рознымі магчымасцямі да актыўнай працы, пошуку, павысіць цікавасць да вывучэння агульнаадукацыйных прадметаў.

**Прадметны тыдзень: задачы, віды, умовы**

Прадметны тыдзень – гэта комплекс тэматычна узаемазвязаных мерапрыемстваў, якія накіраваны на развіццё пазнавальных уменняў і творчых здольнасцей навучэнцаў, павышэнне іх эрудыцыі і пашырэнне кругагляду.

Асноўныя задачы арганізацыі тэматычных тыдняў:

- прыцягненне вучняў да творчай дзейнасці, павышэнне цікавасці да вывучэння агульнаадукацыйных прадметаў;
- выяўленне высокаматываваных навучэнцаў, гатовых да далейшай прадуктыўнай працы над даследчымі праектамі;
- удасканаленне прафесійнага майстэрства педагогаў.

Ва ўстанове адукацыі прадметны тыдзень, незалежна ад выбранага прадмета, мае пэўную сістэму арганізацыі і правядзення. Для аптымальнай рэалізацыі педагагічных ідэй можа быць распрацаваны лакальны дакумент установы адукацыі «Палажэнне аб прадметным тыдні»*, якое рэгламентуе дзейнасць педагогаў і навучэнцаў у пытаннях планавання, арганізацыі і правядзення комплексу мерапрыемстваў.

Прадметны тыдзень у залежнасці ад пастаўленых задач можа быць **монапрадметны** і **поліпрадметны**. Монапрадметны тыдзень прысвечаны непасрэдна адной вучэбнай дысцыпліне і накіраваны на максімальнае раскрыццё ўсіх абласцей і раздзелаў прадмета. Усе спасылкі на другія дысцыпліны разглядаюцца як міжпрадметныя сувязі і не маюць дамінуючага характару. Такі варыянт падыходзіць для дысцыплін, якія «праходзяць» праз увесь школьны курс: мовы, матэматыка, фізіка, геаграфія, гісторыя, фізічная культура, працоўнае навучанне і інш.

Поліпрадметны тыдзень аб'ядноўвае дысцыпліны, якія ў школьным курсе вывучаюцца нядоўгі час, напрыклад, тыдзень музыкі і выяўленчага мастацтва,

* Палажэнне аб прадметным тыдні прадстаўлена на сайце часопіса www.n-asveta.by

тыдзень грамадазнаўства і прафарыентацыі, тыдзень здаровага ладу жыцця (аб'ядноўваюцца дысцыпліны «Дапрызыўная падрыхтоўка», «Медыцынская падрыхтоўка», «Асновы бяспекі жыццядзейнасці»).

Адной з умоў арганізацыі прадметнага тыдня з'яўляецца прымяненне дыферэнцыраванага падыходу з мэтай прыцягнення навучэнцаў з рознымі магчымасцямі. Матэрыялы віктарын і конкурсаў павінны быць даступнымі для ўсіх школьнікаў, каб кожны мог прыняць удзел у большасці запланаваных мерапрыемстваў. Толькі асобныя фрагменты тыдня (алімпіяды, канферэнцыі) могуць вылучаць высокаматываваных дзяцей. Трэба памятаць, што прадметны тыдзень, акрамя павышэння рэйтынгу вучэбнай дысцыпліны, мае вялікі выхаваўчы патэнцыял.

**Планаванне і арганізацыя прадметнага тыдня**

Пры планаванні прадметных тыдняў пытанне аб іх перыядычнасці і тэматыцы можа вырашацца ў адпаведнасці з графікам ўнутранага прадметнага кантролю. Штогадовае трансліраванне ўсіх агульнаадукацыйных прадметаў не мае сэнсу, асабліва ў школах з невялікай колькасцю навучэнцаў.

Першы этап, **арганізацыйны**, прадугледжвае стварэнне творчай групы і папярэдняе планаванне мерапрыемстваў. У план абавязкова ўносяцца як традыцыйныя мерапрыемствы: інфармацыйная маланка, адкрытыя ўрокі, конкурсы вершаў, малюнкаў, фотаздымкаў, бліц-віктарыны, выставы літаратуры, алімпіяды, канферэнцыі і інш., так і нетрадыцыйныя, якія будуць адрозніваюцца ад мерапрыемстваў папярэдніх тыдняў. Тут месца для творчага пошуку і педагогаў, і навучэнцаў. Часта дзеці прапануюць тое, у чым ім хацелася б удзельнічаць: ток-шоу са знакамітымі асобамі, творчыя сустрэчы з паэтамі і пісьменнікамі свайго рэгіёна, экскурсіі, дні тэматычных перапынкаў, кірмашы, фэст-навіны і інш.

Падрыхтоўка сцэнарыяў, метадычных матэрыялаў, вызначэнне ўмовы правядзення і неабходнага абсталявання ажыццяўляецца на **дзейнасным этапе**.

Напярэдадні і на працягу тыдня арганізуецца *агітацыйная кампанія*. Адна з галоўных задач гэтай работы – актыўнае прыцягненне да дзейнасці ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу: педагогаў, вучняў і бацькоў. На спецыяльным стэндзе

размяшчаюцца план тыдня, цікавыя факты аб агульнаадукацыйнай прадмеце, звесткі аб пераможцах алімпіяднага руху, выпускніках школы, якія выбралі блізкія спецыяльнасці. У ходзе правядзення тыдня інфармацыйны стэнд дапаўняецца спісамі пераможцаў конкурсаў, а таксама лепшымі творчымі работамі: вершамі, малюнкамі, фатаграфіямі і г. д.

Асноўная частка мерапрыемстваў **практычнага этапу** прадметнага тыдня падзелена ў залежнасці ад ўзроставай катэгорыі вучняў: 1–4 класы, 5–7 класы, 8–11 класы. У пачатковай школе асаблівай папулярнасцю карыстаюцца гульні і віктарыны, конкурсы малюнкаў, казак, дзе кожны можа прыняць удзел, праявіць свае здольнасці. У сярэднім звяне дзеці аддаюць перавагу розным спаборніцтвам: камандным інтэлектуальным гульням, алімпіядам, конкурсам вершаў, а таксама заданням, якія прадугледжваюць сумесную працу з бацькамі. Старшакласнікі з задавальненнем удзельнічаюць у школьных канферэнцыях, адкрытых форумах, сустрэчах з вядомымі людзьмі.

Афіцыйнае завяршэнне тыдня прыпадае на пятніцу, калі на агульнашкольнай лінейцы падводзяцца вынікі, узнагароджваюцца пераможцы. Але не застаецца без увагі шосты школьны дзень. У суботу абавязкова праводзяцца тэматычныя вечарыны і падвячоркі, якія працягваюць тэму тыдня. Гэты дзень больш свабодны для праяўлення творчасці.

Для навучэнцаў прадметны тыдзень – гэта дадатковы стымул вучэння. Рост удзельнікаў рэспубліканскіх конкурсаў, станоўчая дынаміка за чвэрць і гадавых адзнак, павышаная цікавасць да факультатыўных заняткаў – гэта факты, якія сведчаць аб устойлівым станоўчым выніку правядзення тэматычных і прадметных тыдняў як мадэлі комплекснай пазакласнай працы.

## Майстар-клас
## «Тэматычны прадметны тыдзень як комплексная мадэль пазакласнай работы»

Талака заўсёды была папулярная сярод беларускага народа. Семантычная асаблівасць гэтага слова выражаецца ў групавым узаемадзеянні, накіраваным на вырашэнне пастаўленых задач. У век інфармацыйных тэхналогій гуртавая праца, на жаль, страціла сваю актуальнасць, а на змену ёй прыйшлі новыя кірункі індывідуальных формаў дзеяння. У такіх абставінах арганізацыя пазакласнай работы

па агульнаадукацыйных прадметах суправаждаецца пэўнымі цяжкасцямі. Пазаўрочная дзейнасць не выклікае ранейшую цікаўнасць у вучняў, нягледзячы на шырокі спектр атрымліваемых дывідэндаў. Таму сёння яе актуалізацыя з'яўляеццца метадычнай праблемай і адукацыйнай задачай.

Адзін са шляхоў вырашэння гэтай задачы, які я прапаную, – правядзенне прадметнага тыдня. Правільны і грунтоўны падыход на ўсіх структурных этапах яго арганізацыі забяспечыць стабільны вынік і станоўчую рэфлексію.

**Мэта майстар-класа:** праектаванне тыдня беларускай мовы і літаратуры як комплекснай мадэлі пазакласнай работы.

**Задачы майстар-класа:**

- папулярызаваць правядзенне прадметных тыдняў ва ўстанове адукацыі;
- пазнаёміць педагогаў са структрнай схемай этапаў аганізацыі і правядзення тэматычнага тыдня;
- стварыць умовы для самаадукацыі педагога;
- арганізаваць цеснае творчае ўзаемадзеянне – талаку.

**Месца правядзення:** класны кабінет, умовы размяшчэння – 5 творчых падгруп.

**Абсталяванне:** фанты для 5 груп па колькасці чалавек («Народны здабытак», «Праваслаўны каляндар», «Творчая Маларытчына», «Адкрыты ўрок», «Конкурсы і віктарыны») і 5 візітак на сталах у месцах размяшчэння; лісты фармату А-4 для ўдзельнікаў, алоўкі, маркеры; магнітная дошка, 5 лістоў фармату А-3, магніты для замацавання лістоў; для падгрупы «Народны здабытак» – зборнікі фальклорных твораў; для падгрупы «Праваслаўны каляндар» – праваслаўны каляндар, падбор тэматычных часопісаў і кніжных выданняў; для падгрупы «Творчая Маларытчына» – падшыўка раённай газеты «Голас часу», зборнікі твораў пісьменнікаў Маларыцкага раёна; для падгрупы «Адкрыты ўрок» – праграмы па беларускай мове і літаратуры, каляндарна-тэматычнае планаванне па беларускай мове і літаратуры; для падгрупы «Конкурсы і віктарыны» – падшыўкі часопісаў са змешчанымі выхаваўчымі мерапрыемствамі.

**Ход майстар-класа**

**I. Стартавы этап**

**Педагагічная задача:** падзяліць гасцей майстар-класа згодна з матывацыйна-практычнымі задачамі творчай працы.

**Майстар.** Прыемна павітацца з зацікаўленымі і ініцыятыўнымі педагогамі. Пры ўваходзе прапаную вам выцягнуць фанты, з дапамогай якіх вы размяркуецеся па падгрупах. Згодна візіткам на сталах з назвай падгрупы лёгка вызначыцца, дзе заняць месца.

*Метад «Рэфлексіўнае кола»*

Перад кожным удзельнікам знаходзіцца чысты ліст паперы і алоўкі. Калі ласка, зафіксуйце ваш эмацыянальны стан словам або словазлучэннем і перавярніце ліст.

***Прамежкавы вынік.*** Настаўнікі падзяліліся на 5 падгруп і размясціліся на прапнаваных месцах. Кожны ўдзельнік пакуль дзейнічае індывідуальна. На лістах толькі стартавы эмацыянальны настрой.

**II. Інфармацыйны этап**

**Педагагічная задача:** арганізаваць эмацыянальны пераход ад індывідуальнай да гуртавай працы (талакі), склаўшы ўяўленне аб напрамку дзейнасці.

**Майстар.** Сёння настаўнік павінен гарманічна злучаць навучанне і выхаванне. Для мяне важна, каб усе працэсы, звязаныя з маёй педагагічнай дзейнасцю і ўзаемадзеяннем з вучнямі, актыўна пераходзілі ад «патрэбна» да «жадаю». Толькі зацікаўленасць прадметам можа забяспечыць павышаную матывацыю, працаздольнасць і станоўчыя вынікі. Дзе ж гэты маленькі штуршок да вялікіх перамог? Я знайшла яго ў час правядзення прадметных тыдняў.

Прадметны тыдзень – гэта комплекс узаемазвязаных мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё пазнавальных уменняў вучняў, павышэнне эрудыцыі, праяўленне творчых здольнасцяў. Тыдзень беларускай мовы і літаратуры – гэта яшчэ і метад папулярызацыі роднай мовы сярод моладзі, падстава звярнуцца да творчых вытокаў роднага краю, магчымасць сінтэзаваць навучанне з плынню патрыятызма, самавызначэння, грамадзянства.

Для паспяховага і якаснага выканання задач майстар-класа вы падзелены на 5 падгруп. Я прапаную назваць свае падгрупы згодна з тэматыкай, якая вызначана візіткамі на сталах. На лістах фармату А-3 пазначце назвы.

*Метад «Рэфлексіўнае кола» (працяг)*

Выканаўшы гэтае заданне, зафіксуйце ваш эмацыянальны стан словам або словазлучэннем побач з папярэднім. І зноў павярніце ліст да сябе чыстаю стараною.

***Прамежкавы вынік.*** Арганізавана ўзаемадзеянне ў падгрупах. Кожная атрымала назву. Зафіксаваны эмацыянальны настрой удзельнікаў на этапе стварэння талакі.

***Прамежкавы вынік.*** Прэзентаваны акрэслена-рэгламентаваныя абрысы паэтапнага правядзення тэматычнага прадметнага тыдня. Магчымы зварот да ўдзельнікаў з мэтай больш падрабязнага разбору арганізацыйнага этапа.

**III. Этап праектнага мадэліравання**

**Педагагічная задача:** вызначыць кампаненты працэса арганізацыі і правядзення тэматычнага тыдня, забяспечыць працу падгруп для творчага афармлення плана правядзення прадметнага тэматычнага тыдня беларускай мовы і літаратуры; правесці прэзентацыю праектаў.

***Майстар.*** Кожная падгрупа мае сваю назву, якая супадае з назвай дня тыдня (назва акрэслівае тэматычныя напрамкі дзейнасці). Пры правядзенні прадметных тыдняў структурна акрэсліваюцца тры этапы: арганізацыйны, дзейнасны і практычны. Перад намі галоўныя задачы арганізацыйнага этапа – планаванне мерапрыемстваў, вызначэнне іх метадычных асаблівасцей, канкрэтызацыя форм, умоў правядзення. Кожная з груп павінна спланаваць мерапрыемствы на дзень з улікам ахопу ўсіх узроставых катэгорый, дыферынцыраванага падыходу, узроўней паспяховасці вучняў.

*Запаўняецца кластэр 1.* Для прадуктыўнай працы мэтазгодна выкарыстоўваць дапаможны матэрыял, які падрыхтаваны для кожнай з груп.

Кластар 1




***Абагульняючы вынік.*** Замацаваныя на дошцы праекты дзён уяўляюць сабой план тыдня беларускай мовы і літаратуры, які ахоплівае некалькі тэматычных кірункаў.

*Метад «Рэфлексіўнае кола» (вынік)*

Пасля таго як наша дзейнасць атрымала выгляд плана тыдня, я прашу на зваротных лістах напісаць ваш эмацыянальны стан, які забяспечыла праца талакой.

Такім чынам мы бачым, што ў працы гуртам нараджаецца намнога больш ідэй і праектаў, чым пры індывідуальнай.

**IV. Этап рэфлексіі і падвядзення вынікаў.**

Майстар прапануе:

- ✓ назваць тое мерапрыемтсва з раней прэзентаваных, якое кожнаму хацелася б дасканала распрацаваць і правесці для вучняў, бацькоў, педагогаў; растлумачыць выбар;
- ✓ даць кароткую ацэнку агульнаму праекту «Тыдзень беларускай мовы і літаратуры».

**Майстар.** Спадзяюся, што праведзеная праца была карыснай для кожнага. Вельмі важна знаходзіць асалоду ад таго, што ты робіш. У заключэнне майстар-класа мне хацелася б расказаць прытчу пра схаванае шчасце.

*Аднойчы Богі вырашылі пасмяяцца з людзей:*

*– Давайце што-небудзь у іх адбярэм і схаваем! – пасля нядоўгага роздуму выкрыкнуў адзін з багоў.*

*– Я ведаю, – адгукнуўся другі, – мы схаваем ад людзей шчасце. Занясем яго на самую высокую гару.*

*– Не. Памятай, што ў людзей вялікая сіла. Нехта адзін дабярэцца да вяршыні і раскажа ўсім іншым, – адказалі яму.*

*– Схаваем яго тады на дне мора, – прапанаваў трэці бог.*

*– Не, людзі дапытлівыя. Пабудуюць апарат для плавання пад вадой і знайдуць шчасце, – аспрэчылі прапанову.*

*– Аднясем шчасце на іншую планету! – папанаваў нехта яшчэ.*

*– Не, людзі вельмі разумныя. Прыйдзе час, і яны пабудуюць карабель і знойдуць шчасце на іншай планеце.*

*Тут загаварыў самы старэйшы бог, які дагэтуль увесь час маўчаў і толькі слухаў:*

*– Я ведаю, дзе схаваць шчасце, каб яго не змаглі знайсці людзі. Схаваем шчасце ў іх саміх. Яны будуць так занятыя пошукамі шчасця звонку, што не змогуць знайсці яго ў сабе.*

*Багі згадзіліся.*

*З таго часу людзі губляюць сваё жыццё ў пошуках шчася і не ведаюць, што яно ў іх саміх.*

Хочацца пажадаць, каб ваш шлях да шчасця быў кароткі і паспяховы, а работа прыносіла задавальненне і плён.

### Літаратура


1. **Глинский, А. А.** Актуальные вопросы современного школоведения / А. А. Глинский. – Минск: Зорны Верасок, 2010
2. **Жолондевская, С. П.** Предметные недели в школе / С. П. Жолондевская, И. М. Ключенович, Е. И. Кнаш, – Минск: Красико-Принт, 2013
3. **Никончук, А. С.** Шестой школьный день / А. С. Никончук. – Минск: Нац. Ин-т образования, 2011